**Георгій Мікалаевіч Міхалькевіч**

# Да пытання аб народнай дыпламатыі ў беларуска-польскіх дачыненнях

Wschodnioznawstwo 5, 23-33

2011

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

Георгій Мікалаевіч Міхалькевіч

# Да пытання аб народнай дыпламатыі ў беларуска-польскіх дачыненнях

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі Віллі Брандт аднойчы заўважыў: міжнародныя дачыненні настолькі значныя, што іх нельга аддаваць на водкуп выключна дзяржаўным установам. У мудрасці гэтых слоў пераконваюць як прыкрыя непаразуменні ў міждзяржаўных беларуска-польскіх стасунках апошняга часу, так і плённыя вынікі шматгадовых намаганняў беларускай і польскай грамадзянскай супольнасцяў на карысць абодвух народаў. Плён, зрэшты, цалкам лагічны, бо адлюстроўвае натуральнае імкненне большасці людзей да ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва.

Адзначанае тычыцца не толькі нашых дзяржаў. Сёння ў сусветнай паліталогіі набірае папулярнасць канцэпцыя „урады супраць народаў, народы супраць урадаў", бо, па сутнасці, цяжка назваць такую краіну, у якой палітыка ўрада ў той ці іншай ступені не супярэчыла б інтарэсам народа гэтай краіны.

Існуе меркаванне, што эфектыўнасць народнай дыпламатыі яе прыхільнікамі перабольшваецца, маўляў, тон у дыялогу краін задаюць правячыя эліты. І сапраўды, прыходзіцца канстатаваць, што нядобразычлівыя інтанацыі ў вышэйшых эшалонах улады звычайна пранікаюць у свядомасць і лексіку простага абывацеля. Гэта пацвярджаюць і праведзеныя шматлікія сацыялагічныя даследаванні як у Польшчы, так і ў Беларусі. Тым не менш, можна сцвярджаць, што менавіта нашы народы стрымліваюць рэальна негатыўны сцэнарый, зберагаюць фундамент добрасуседства праз рэгулярныя зносіны са сваімі роднымі, блізкімі, праз супрацоўніцтва са шматлікімі калегамі. Такі жыццёвы досвед з'яўляецца асабліва важкім з той прычыны, што абедзве краіны не толькі шматнацыянальныя, але і кожная мае даволі значную колькасць жыхароў, якія прадстаўляюць карэнную нацыянальнасць дзяржавы-суседкі. Палітыкі вымушаны ўлічваць гэтую рэальнасць, каб аднойчы не пераступіць нейкую фігуральна кажучы „чырвоную рысу".

Аб беларуска-польскіх палітычных непаразуменнях апошнім часам неаднаразова гучна заяўлена на афіцыйным узроўні, яшчэ больш напісана журналістамі, рознага кшталту аналітыкамі. Таму падаецца карысным звяр-

нуцца да пазітыўнага вопыту ў нашых дачыненнях, які дэманструюць суб'екты так званай народнай дыпламатыі і паспрабаваць выявіць, што сёння замінае іх стваральнай працы.

У рэчышчы беларуска-польскага супрацоўніцтва шчыруе шмат грамадскіх структур, але асаблівы інтарэс у кантэксце народнай дыпламатыі ў аўтара выклікае дзейнасць старэйшых таварystваў „Беларусь-Польшча" і „Польшча-Беларусь". Адзначаныя няўрадавыя арганізацыі ўзніклі адразу пасля распаду СССР – у 1991 і 1992 г. адпаведна. Іх станаўленню паспрыялі багатыя традыцыі, назапашаныя амаль за чатыры дзесяцігоддзі існавання таварystваў польска-савецкай і савецка-польскай дружбы (у прыватнасці, яго польскага аддзялення). Такі „радавод" часам дае падставу нядобразычліўцам для нараканняў на ідэалагічную архаічнасць гэтых арганізацый і палітычную ангажаванасць іх кіраўніцтва. Але, напэўна, лічыць ідэалогію добрасуседства паміж народамі анагажаванай як найменш – прадузятасць.

Поспех кожнай грамадскай справы, тым больш поспех доўгатэрміновы, трымаецца на асобе. У гэтым сэнсе народнай дыпламатыі на беларускім і польскім кірунках пашчасціла. Так, у абедзвюх краінах добра вядомы як адданы руплівец прыязных адносін паміж нашымі народамі Баляслаў Хмяліньскі – прафесар Лодзінскай вышэйшай школы менеджменту. З ініцыятывай заснавання таварыства „Польшча-Беларусь" (далей ТПБ) разам з аднадумцамі ён выступіў яшчэ ў 1992 г., быў абраны генеральным сакратаром ТБМ, а з 1997 г. з'яўляецца старшынёй яго праўлення. Прызнаннем заслуг таварыства перад польскай дзяржавай можна лічыць узнагароду Б. Хмяліньскага падчас прэзідэнцтва А. Кваснеўскага ордэнам „Афіцэрскі крыж". Навуковы аналіз дзейнасці ТБП лёг у аснову манаграфіі Б. Хмяліньскага „Таварыства Польшча-Беларусь: за добрасуседства абодвух народаў[1]" і доктарскай дысертацыі „Грамадскі рух у Польшчы за добрасуседства з Беларуссю (1991-2006 гг.)", якую ён абараніў у 2007 г. ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (далей – БДУ). У грунтоўным даследаванні прафесара сістэматызаваны і прааналізаваны багаты эмпірычны матэрыял, зроблены навуковыя высновы, у заключэнні выказаны пэўныя рэкамендацыі беларускаму боку па далейшым развіцці грамадскага руху добрасуседства.

Гісторыя стварэння таварыства „Беларусь-Польшча" (далей – ТБП) звязана з іменем былога загадчыка кафедры дыпламатычнай і консульскай службы БДУ Леаніда Лойкі. Наш калега ў 80-я гады працаваў у Варшаве дырэктарам Дома савецкай навукі і культуры, адначасова – першым сакратаром, а затым саветнікам пасольства СССР у ПНР. Дарэчы, паміж іншым, ён адказваў за аналіз палітычнай сітуацыі ў краіне. Як сцвярджаюць дасведчаныя людзі, у тым, што развіццё пад-

---

1 Б. Хмяліньскі, *Таварыства Польшча-Беларусь: за добрасуседства абодвух народаў*, Мінск 2006.

зей у Польшчы не пайшло па драматычным сцэнары ўзору Чэхаславакіі 1968 г. – заслуга і яго ўзважаных палітычных ацэнак і прагнозаў, што паступалі ў Маскву з савецкага пасольства. Удзячныя варшавяне ўшанавалі Л. Лойку званнем ганаровага грамадзяніна свайго горада[2]. Пасля вяртання ў Мінск навуковым вынікам яго працяглай замежнай камандзіроўкі сталі чатыры манаграфіі, прысвечаных польскай праблематыцы. Адна з іх – „Испытание на прочность[3]" – утрымлівае глыбокі аналіз дзейнасці Таварыства польска-савецкай дружбы. Пазней Леанід Вікенцьевіч неаднойчы прызнаваўся, што праца ў Польшчы стала вызначальнай у яго лёсе. Цалкам лагічным бачыцца тое, што такі чалавек не абмежаваўся навуковай аналітыкай, а стаяў у 1991 г. ля вытокаў стварэння ў суверэннай Беларусі грамадскай арганізацыі, якая мела на мэце развіццё і паглыбленне супрацоўніцтва з Польшчай, і кіраваў ёй да апошніх дзён жыцця.

З 2007 г. ТБМ узначальвае Анатоль Бутэвіч – у мінулым міністр культуры і друку Беларусі, генэральны консул Беларусі ў Гданьску, пасол у Румыніі. Кожная з названых пасад мае паміж іншым на ўвазе і добрае валоданне праблематыкай народнай дыпламатыі. Апроч таго, старшыня таварыства шырока вядомы як выдатны пісьменнік, публіцыст і таленавіты перакладчык, у тым ліку з польскай мовы на беларускую.

Высокі аўтарытэт згаданых вышэй асоб у грамадскай супольнасці абедзвюх краін, іх выдатныя арганізацыйныя здольнасці, багаты жыццёвы досвед і, галоўнае, самаадданасць высакароднай справе ўмацавання супрацоўніцтва нашых народаў у значнай ступені вызначаюць пасяховасць шматлікіх ініцыятыў таварystваў „Беларусь-Польшча" і „Польшча-Беларусь". Праўда, сёння нельга не заўважыць праблему змены пакаленняў, пераважна сталы ўзрост актыву арганізацый, што ў сваю чаргу вымушае шукаць новыя формы працы з моладдзю – галоўным рэзервам захавання патэнцыялу таварыстваў.

Агульнавядома, што народная дыпламатыя ў не заўсёды спрыяльных абставінах стварае першасныя ўмовы, так бы мовіць, належны маральна-палітычны клімат для фарміравання дыпламатыі афіцыйнай, зніжае канфліктны патэнцыял міждзяржаўных дачыненняў. Маштабнасць мэтаў ТПБ і ТБП, як палягае з іх статутных дакументаў, цалкам адпавядае бачанню такога прызначэння. Так, напрыклад, ТПБ мае на мэце наступнае:

- садзейнічанне будаўніцтву і развіццю добрасуседскіх адносін, супрацоўніцтва і дружбы паміж польскім і беларускім грамадствамі на прынцыпах роўнасці, партнёрства, узаемнай карысці, даверу і павагі;
- спрыянне развіццю эканамічнага, навукова-тэхнічнага, спартыўна-турыстычнага супрацоўніцтва, гандлёваму абмену, а таксама вылучэнне і падтрымка сумесных ініцыятыў у гэтых галінах;

2 Г. М. Міхалькевіч, *Леанід Лойка. Маштаб асобы*, „Вышэйшая школа" 2007, № 6, с. 79-80.
3 Л. Лойка, *Испытание на прочность*, Минск 1989.

- арганізацыя і падтрымка абмену паміж людзьмі, развіццё непасрэдных кантактаў паміж сем'ямі, знаёмымі, прафесійнымі групамі і асяродкамі, установамі культуры і асветы, прадпрыемствамі і населенымі пунктамі;
- распаўсюджванне глыбокіх ведаў і каштоўнасцей культуры польскага і беларускага народаў[4].

Маштабнасць мэтаў ТПБ суадносіцца з маштабнасцю яго спраў: гэта і ўстанаўленне партнёрскіх сувязяў паміж беларускімі і польскімі гарадамі, прамысловымі і сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, ВНУ і школамі, і арганізацыя адпачынку беларускіх дзяцей у Польшчы, і правядзенне шматлікіх грамадска-культурных мерапрыемстваў.

Асобныя праекты таварыства набылі агульнадзяржаўнае і міжнароднае значэнне і гучанне. Так атрымалася, што сімвалічна ў кантэксце асаблівасцей беларускай моўнай рэчаіснасці, з ініцыятывай правядезння штогадовай Алімпіяды па беларускай мове і літаратуры сярод польских школьнікаў; дарэчы, дагэтуль – адзінай за межамі Беларусі. Пачатак быў пакладзены ў 1993 г. Першы аргкамітэт алімпіяды ўзначаліў загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта прафесар Аляксандр Баршчэўскі. Згодна з рашэннем Міністэрства нацыянальнай адукацыі Польшчы алімпіяда атрымала статус прадметнай, яе лаўрэаты вызваляюцца ад адпаведнага экзамену на атэстат сталасці, залічваюцца без уступных экзаменаў на шэраг спецыяльнасцей польскіх ВНУ. Адбылося ўжо 17 алімпіяд. Кожная з іх мела сваю тэматыку, якая датычылася ведаў аб знакамітых беларускіх класіках літаратуры. Напрыклад, IV алімпіяда прэзентавала ідэю рамантызму ў жыцці і творчасці Яна Баршчэўскага, Яна Чачота і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, крытыкі царызму ў творчасці Францішка Багушэвіча і Канстанціна Каліноўскага, а таксама канцэпцыі пазітывізму ў літаратуры перыяду „Нашай нівы", VI алімпіяда – паэму Якуба Коласа „Новая зямля" як вобраз беларускага сельскага жыцця, VIII – творчасць Максіма Танка. Алімпіяда ўключае тры этапы, фінал праводзіцца ў Беларусі – на возеры Свіцязь, у Навагрудку, мінскім Доме дружбы. У 2006 г. алімпіяда была ўключана ў план супрацоўніцтва Варшаўскага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У Беларусь звычайна прыязджаюць разам са сваімі настаўнікамі каля 30 фіналістаў, сустракаюцца з беларускімі равеснікамі ў школах, клубах, асяродках творчай працы, што спрыяе ўстанаўленню і развіццю сяброўскіх кантактаў паміж моладдзю абедзвюх дзяржаў[5].

Таварыства мае сталыя сувязі з пасольствам і консульскімі ўстановамі Беларусі ў Польшчы, увесь час карыстаецца іх падтрымкай. Так, па ініцыятыве дыпламатаў з мэтай устанаўлення кантактаў і развіцця супрацоўніцтва

---

4 Б. Хмяліньскі, *Таварыства Польшча-Беларусь…*, с. 28-29.

5 Idem, *Гісторыя беларусістыкі ў польскіх ВНУ*, „Вышэйшая школа" 2006, № 6, с. 25-27.

з адпаведнымі беларускімі грамадскімі арганізацыямі 15-17 красавіка 2009 г. быў арганізаваны візіт у Беларусь шматлікай дэлегацыі кіраўніцтва і актыву таварыстваў „Польшча – Беларусь" і „Польшча – Усход," і іх рэгіянальных аддзяленняў у Беластоку, Бяла Падлясцы, Вальбжыху, Гданьску, Лодзі. Члены дэлегацыі сустрэліся з кіраўніцтвам Мінска, Івацэвіцкага і Стаўбцоўскага раёнаў, наведалі Дом-музей Т. Касцюшкі ў Мерачоўшчыне, замкавы комплекс „Мір", мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю Я. Коласа і А. Міцкевіча ў Стаўбцоўскім і Навагрудскім раёнах, Нацыянальную бібліятэку і Нацыянальны мастацкі музей. Падчас сустрэч былі абмеркаваны пытанні актывізацыі і пашырэння дзейнасці па развіцці беларуска-польскіх адносін, падпісання пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж гарадамі і рэгіёнамі Беларусі і Польшчы[6].

У сакавіку 2011 г. па ініцыятыве Паморскага аддзялення ТПБ і пры падтрымцы Генеральнага консульства Беларусі ў Гданьску і Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы быў арганізаваны прэс-тур польскіх журналістаў па нашай рэспубліцы[7].

Удзячнасць пасольству за дапамогу ў рэалізацыі шматлікіх планаў ТПБ яго старшыня Б. Хмяліньскі выказваў сёлета, выступаючы 3-га лютага на пасяджэнні галоўнага праўлення таварыства з дакладам „Аб выніках працы ў 2010 годзе і задачах на 2011 год". У рабоце пасяджэння браў удзел саветнік беларускага дыппрадстаўніцтва В. М. Чэрнік[8].

Увогуле старшыня ТПБ як у прыватнай размове, так і публічна неаднаразова прызнаваў, што беларускаму дыппрадстаўніцтву ў Варшаве шанцуе на высокаадукаваных, добразычлівых, інтэлігентных кіраўнікоў. Менавіта асобасныя якасці паслоў У. Л. Сянько, Г. С. Таразевіча, В. І. Бурскага, М. В. Крэчкі, П. П. Латушкі, В. А. Гайсёнка, на яго думку, у значнай ступені вызначалі і вызначаюць спрыяльныя ўмовы дзейнасці таварыства. На жаль такога стаўлення да спраў ТПБ часам бракуе з боку асобных гаспадроў уладных кабінетаў у беларускай сталіцы.

Сугучна ТПБ амбіцыйныя мэты дэкларуе статут ТБП. У пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя ТПБ мела права юрыдычнай асобы, разгалінаваную сетку падраздзяленняў на тэрыторыі рэспублікі, утварыла некалькі камерцыйных структур і перадала ім карысныя кантакты з польскімі партнёрамі. Усё гэта дазваляла на роўных супрацоўнічаць з таварыствам ТПБ і іншымі грамадскімі арганізацыямі суседняй краіны, праводзіць сумесныя навуковыя канферэнцыі,

---

6 *Аб візіце ў Беларусь дэлегацыі таварystваў „Польшча – Беларусь" і „Польшча – Усход"*, http://www.poland.belembassy.org (15 V 2011).

7 *Более 20% жителей Гродненской области – поляки по национальности*, http://slonim.grodno-region.by/ru/news/region?id... – 82k (15 V 2011).

8 *Аб пасяджэнні Галоўнага праўлення Таварыства „Польшча-Беларусь"*, http://www.poland.belembassy.org/ – 24k (15 V 2011).

накіроўваць у Польшчу дэлегацыі, прымаць у Беларусі прадстаўнікоў польскай грамадскасці. Пасля прыняцця новага закона аб грамадскіх арганізацыях ТПБ было пазбаўлена правоў юрыдычнай асобы і сёння з'яўляецца як бы секцыяй Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі (далей – БТД), якое само абмежавана ў фінансавых сродках. Магчымасці ТБП па арганізацыі сумесных з польскімі сябрамі акцый на грамадскіх пачатках і без належнай матэрыяльнай падтрымкі вельмі сціплыя. Бакі не могуць прытрымлівацца прынцыпу ўзаемнасці – базавага імператыву міжнародных дачыненняў.

Як вынікае з інтэрв'ю А. Бутэвіча, якое ён даў у сакавіку 2010 г. карэспандэнту Беларускай службы Польскага радыё для замежжа, таварыства сёння аддае прыярытэт культурна-асветніцкай дзейнасці. У прыватнасці, ён адзначыў:

> Мы для сябе вызначылі ўдалую формулу – сумоўе. Каб мы нейкім чынам прапагандавалі, ухвалялі, падтрымлівалі тут падзеі, зьявы, факты, зьвязаныя з польскай культурай. Але мы гэтак жа зацікаўленыя, каб падзеі, зьявы, факты беларускай гісторыі й культуры – аналагічна атрымлівалі гучанне ў Польшчы. Мы маем падпісаныя дамовы з многімі польскімі структурамі. На гэты год у нас ёсьць магчымыя сумесныя акцыі – сьвяткаваньне 600-годзьдзя Грунвальдзкай бітвы, год 200-годзьдзя Шапэна, магчымасьць усталяваньня помніка Якубу Коласу ды Янку Купалу ў Варшаве. Мы хочам, каб да юбілею клясыкаў у 2012 годзе такі помнік у Варшаве быў[9].

Падаецца цалкам лагічным, што ТБП і ТПБ пазіцынуюць сябе як партнёрскія арганізацыі. Фармальныя рамкі ўсебаковага партнёрства вызначаюць штогадовыя пратаколы аб супрацоўніцтве абедзвюх арганізацый.

Кіраўніцтва таварыстваў выказваецца за максімальнае пашырэнне кола прыхільнікаў ідэі беларуска-польскага добрасуседства і іх узаемадзеянне, а якасці сваіх патэнцыяльных партнёраў бачыць арганізацыі этнічных палякаў у Беларусі і беларускія суполкі ў Польшчы. Яшчэ ў лістападзе 1994 г. па ініцыятыве ТБП і ТПБ у Гродна адбылася сустрэча кіраўніцтваў чатырох арганізацый, якія па вызначэнні маюць адзіныя мэты і агульнае поле дзейнасці: таварыства „Беларусь-Польшча", Саюз палякаў Беларусі, таварыства „Польшча-Беларусь" і Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Па выніках той сустрэчы было заяўлена аб гатоўнасці: падтрымліваць развіццё ўсебаковага, добрасуседскага ўзаемадзеяння Беларусі і Польшчы; умацоўваць маральна-палітычную атмасферу ў адносінах паміж беларусамі і палякамі як у Беларусі, так і ў Польшчы; пашыраць веды і ўзаемна паважаць культуру

[9] А. Багданаў, *Пра дзейнасьць таварыства „Беларусь-Польшча" распавядае яго старшыня Анатоль Бутэвіч*, http://old.kamunikat.org/8347.html - 32k (15 V 2011).

і гістарычныя традыцыі абодвух народаў; папярэджваць спробы ўскладнення міждзяржаўных, міжнацыянальных адносін у абедзвюх краінах (курсіў мой. – Г. М.)[10]. На жаль, наладзіць пастаяннае супрацоўніцтва ці хаця б каардынацыю дзейнасці на вызначаных напрамках арганізацыям не ўдалося. На тое былі як аб'ектыўныя прычыны, так і суб'ектыўныя (асобасныя). Канфліктная сітуацыя ў Саюзе палякаў у Беларусі і вакол яго яшчэ больш ускладніла праблему ўзаемадзеяння. Вядома, што кіраўніцтва ТБП у асобе Л. Лойкі і яго калегі з ліку этнічных палякаў ад пачатку выступалі за цярплівае пераасэнасаванне пунктаў гледжання ўсіх удзельнікаў канфлікту, за пошук альтэрнатыўнага варыянту яго вырашэння. Напрыклад, яшчэ ў 2007 г. выказвалася слушная, як падаецца, ідэя кансалідацыі дзеючых у рэспубліцы польскіх грамадскіх арганізацый, такіх як „Польскае навуковае таварыства", „Харцэрства", „Polska Macierz Szkolna", „Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі" і, зразумела, як афіцыйна прызнанага, так і апазіцыйнага саюзаў палякаў Беларусі ў рамках нейкай федэрацыі, ці канфедэрацыі. Закон Рэспублікі Беларусь „Аб грамадскіх аб'яднаннях" дапускае такі ход падзей. Гэта стварыла б новую рэальнасць сярод беларускіх грамадзян польскай нацыянальнасці, часткова супакоіла б эмоцыі, унесла карэктывы ў рашэнне польскай праблемы. Федэратыўнае аб'яднанне, на думку аўтараў ідэі, „карысталася б „ціхай" (няяўнай) падтрымкай абодвух бакоў, дзейнічала б у адпаведнасці з беларускім заканадаўствам і міжнароднымі актамі па правах чалавека і правах нацыянальных меншасцяў". Пры лаяльным стаўленні да яе беларускай дзяржавы федэрацыя з часам магла б стаць партнёрам як для мясцовых уладаў у рашэнні праблем польскай нацыянальнай меншасці, так і ў адносінах з польскім бокам. Папярэднія перамовы з зацікаўленымі асобамі, вывучэнне настрояў у асяроддзі польскай дыяспары сведчылі, што ініцыятыва магла мець добрыя шанцы на поспех. На жаль рэалізавана яна не была (у 2007 г. не стала Л. Лойкі), але, на нашу думку, сваёй актульнасці ў кантэксце апошняга развіцця падзей не страціла[11].

Сённяшняе кіраўніцтва ТБП свядома дыстанцыіруецца ад таго, што адбываецца вакол Саюза палякаў. На просьбу карэспандэнта Польскага радыё пракаментаваць сітуацыю ў асяроддзі польскай дыяспары, у прыватнасці, канфлікт вакол Польскага дома ў Івянцэ, А. Бутэвіч адказаў наступнае:

> Таварыства было й застаецца грамадзкай арганізацыяй, якая не датычыць палітыкі й ня будзе ўлазіць у палітыку. Што датычыць канкрэтна гэтых падзей – не камэнтую, не хачу ўнікаць і ня буду займацца. Ёсьць людзі, якія гэтым жывуць, якім гэта цікава. Мяне цікавіць трошкі іншае[12].

---

10 Б. Хмяліньскі, *Таварыства Польшча-Беларусь…*, с. 150.

11 Л. В. Лойка, *Да пытання аб стасунках з Польшчай: інфармацыйна-аналітычная нататка*, Бягучы архіў кафедры дыпламатычнай і консульскай службы БДУ, 2007 г.

12 А. Багданаў, *op.cit.*

Непрадузяты аналіз сведчыць, што за час расколу ў структурах польскай дыяспары шмат памылак было дапушчана абодвума бакамі. Таму падаецца, што было б надзвычай карысна пачаць усё з „чыстага ліста". Польскія грамадскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (як і беларускія ў Польшчы), могуць і павінны адыгрываць пазітыўную ролю ў наладжванні добрасуседскіх адносін паміж нашымі краінамі, а не наадварот, як гэта мае месца ў апошні час. Сказанае аднолькава тычыцца і праўладных, і апазіцыйных структур.

Пытанню меншасцей у беларуска-польскіх дачыненнях яўна бракуе слушнай ацэнкі з боку беларускіх і польскіх палітычных эліт. Меншасці маглі б быць выкарыстаныя як мост для наладжвання двухбаковых стасункаў. Замест гэтага палітыкі і СМІ акцэнтуюць увагу выключна на пераследзе меншасцей уладамі – як беларускімі, так і польскімі. Варта прыслухацца да разважанняў даследчыка з Брэменскага ўніверсітэта (Германія) Кірылы Касцяна, які бачыць уразлівасць польскай пазіцыі ў гэтым пытанні ў нежаданні разумець розніцу паміж калектыўнымі правамі меншасцей і асабістым правам людзей свабодна дэклараваць сваю этнічную прыналежнасць, з аднаго боку, і правам на свабоду асацыяцый – з другога. Як вынік такога падыходу – этнічныхмі палякамі прызнаюцца толькі тыя, хто належыць да „нелегальнага" Саюза палякаў, а ціск беларускіх уладаў на членаў гэтай групы трактуецца як рэпрэсіі супраць усёй польскай меншасці[13], бо як тлумачыць той факт, што, напрыклад, у свой час стала „неўязной" у Рэспубліку Польшча старшыня Слонімскага аддзялення „афіцыйнага" СПБ Леанарда Раўкоўская – заслужаны дзеяч культуры Польшчы, лаўрэат чатырох польскіх узнагарод, ініцыятар агульнавядомага ў абедзвюх краінах фестывалю „Паланэз". Каб абараніць сваю годнасць і мець магчымасць зносін з роднымі ў Польшчы жанчына была вымушана звяртацца ў суд Варшавы, які, трэба аддаць яму належнае, прыняў рашэнне на яе карысць[14]. Але ці ўпрыгожвае гэты прыклад афіцыйную польскую дыпламатыю? На жаль, можна прывесці і іншыя, падобныя гэтаму, прыклады.

Беларускі бок даследчык перад усім папракае у абмежаваннях свабоды асацыяцый.

З улікам выразна негатыўнага стаўлення беларускіх уладаў да дзейнасці незарэгістраванага Мінюстам Саюза палякаў механізм этнічнага самавызначэння праз „карту паляка" для прадстаўнікоў дыяспары сёння выступае як прымушэнне да адкрытага самавызначэння палітычнага. Лішнім будзе пытанне аб тым, ці ўсе беларускія палякі зараз гатовыя напрост выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю.

---

13 К. Касцян, *Ці ведае Польшча Беларусь?*, „The Point" 20 III 2011.

14 *Более 20% жителей…*

Цяжка не пагадзіцца з высновамі К. Касцяна аб тым, што „недахопам польскай палітыкі адносна Беларусі ёсць тэндэнцыя польскіх элітаў глядзець на ўсходняга суседа праз прызму наяўнасці „дыктатара Лукашэнкі”, ігнаруючы пры гэтым патрэбы людзей”. І далей:

> цягам апошніх некалькіх гадоў беларускі ўрад паказаў сваю гатовасць да супрацы з ЕС і дазволіў абмежаваную лібералізацыю. У гэтым можна пабачыць магчымасць для развіцця і сталення беларускай грамадзянскай супольнасці ва ўмовах сучаснага палітычнага рэжыму і перадумовы для ажыццяўлення зменаў знутры. Наіўна чакаць ад беларусаў егіпецкага сцэнару. Таму падаецца больш мэтазгодным выкарыстоўваць існыя магчымасці і не ізаляваць краіну (і найперш яе народ) шляхам увядзення абмежаванняў на супрацу і дыялог[15].

Прыкра, але факт: патэнцыял беларускай меншасці ў Польшчы ў кантэксце пасрэдніцтва ў дыялогу краін наогул ніколі не згадваецца.

Падаецца што даследаванне фактара этнічных меншасцей у беларуска-польскіх палітычных камунікацыях – неблагая тэма для сумеснага навуковага праекта.

Вядома, палітычны фон апошняга часу для такіх разважанняў не самы спрыяльны. Але, як было ўжо вышэй адзначана, суб'екты народнай дыпламатыі ў ідэале і павінны гэты фон паступова зняць. Дзяржаўныя ж інстытуты, як найменш, не павінны перашкаджаць іх намаганням і, па магчымасці, падтрымліваць арганізацыйна і матэрыяльна польскі і беларускі рух за дабрасуседства як дзейсны фактар беларуска-польскіх дачыненняў.

У чым жа можа выяўляцца, на наш погляд, такая падтрымка з беларускага боку?

Мэтазгоднымі бачацца новыя ініцыятывы ў пашырэнні ўзаемадзеяння ў галіне культуры, навукі, адукацыі. Было б дарэчы стварэнне на радыё і тэлебачанні некалькіх культурных і навуковых праграм па польскай тэматыцы. У якасці суаўтараў і ўдзельнікаў такіх праграм можна было б залучыць прадстаўнікоў інтэлігенцыі з польскай дыяспары, часцей запрашаць гасцей з суседняй краіны. Адкрытая размова, у тым ліку і па складаных пытаннях нашых стасункаў, садзейнічала б ліквідацыі стэрэатыпаў, міфаў і спрашчэнняў у ацэнцы адзін аднаго. Аб запатрабаванасці такой размовы для шырокай аўдыторыі аўтар падумаў падчас прэзентацыі кнігі былога віцэ-міністра культуры Польшчы, выдатнага пісьменніка Міхала Ягелы „Народы і народнасці”, якую ў красавіку гэтага года ладзіў Польскі інстытут у Мінску ў сваім сціплым памяшканні для вузкага кола зацікаўленых асоб.

Эфектыўным станоўчым крокам беларускага боку стала б адкрыццё ў адной з агульнаадукацыйных школ Мінска класа (класаў) з польскай мовай наву-

---

15 К. Касцян, *op.cit.*

чання ці з выкладаннем шэрагу дысцыплін на польскай мове (апошняе больш пажадана). Як варыянт – правядзенне штогадовай алімпіяды па польскай мове і літаратуры. Яе арганізацыю можна даручыць органам адукацыі сумесна з грамадскімі аб'яднаннямі (ТБП, Польскае навуковае таварыства, Беларускі саюз палякаў і інш.). Такая акцыя знайшла б станоўчы водгук сярод польскай грамадскасці і садзейнічала б кансалідацыі польскай меншасці ў Беларусі.

Як адзначае ў сваім даследаванні Б. Хмяліньскі, польскія грамадскія арганізацыі добрасуседства адчуваюць недахоп інфармацыйна-даведачнай літаратуры аб Беларусі. Было б добра, каб частка тыражу часопіса „Беларусь" выдавалася на польскай мове і распаўсюджвалася ў Польшчы ўдзельнікамі грамадскага руху за добрасуседства.

Варта было б праводзіць пад патранатам Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь штогадовую нараду з удзелам прадстаўнікоў беларускіх грамадскіх арганізацый (ТБП, БОД, Беларускага фонда культуры, Польскага навуковага таварыства і інш.), беларускіх СМІ, навучальных і навуковых устаноў, прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў, адміністрацыі гарадоў, якія маюць цесныя сувязі з польскімі гарадамі, для абмеркавання шляхоў актывізацыі ўсебаковага ўзаемадзеяння з польскімі партнёрамі. Неаднаразова выказвалася прапанова разгледзець магчымасць рэгістрацыі Мінюстам ТБП у якасці юрыдычнай асобы, каб прытрымлівацца прынцыпаў узаемнасці і роўнасці ў адносінах паміж грамадскімі аб'яднаннямі дзвюх краін.

Важна маральна падтрымаць актыў прыязных польскіх арганізацый. Як вядома, летам 2012 г. ТБП спаўняецца 20 гадоў. Прадстаўленне да дзяржаўных узнагарод Рэспублікі Беларусь яго старшыні – Баляслава Хмяліньскага, аднага-двух актывістаў таварыства было б дарэчы напярэдадні маючага быць юбілею.

Ёсць дастаткова падстаў сцвярджаць, што кожны канструктыўны крок беларускага бока выкліча разуменне і станоўчую рэакцыю як польскай дыяспары, так і грамадскасці і палітычнай эліты і паспрыяе нармалізацыі беларуска-польскіх дачыненняў.

Вышэй выказваліся некаторыя меркаванні адносна пазіцыі польскага боку. Калі б аўтар узяў на сябе адказнасць дэталізаваць адпаведныя пажаданні, падаецца, што шмат у чым яны былі б сугучнымі.

Застаецца спадзявацца, што народная дыпламатыя, за якой трывала замацавалася вызначальнае месца ў напаўненні рэальным зместам агульначалавечага вымярэння вонкавай палітыкі, у рэшце рэшт падштурхне да больш актыўнага дыялогу і супрацоўніцтва і ўладныя інстытуты нашых дзяржаў.

## Summary

Gieorgij Mikołajewicz Michalkiewicz

**Towards the issue of public diplomacy in the Belarusian-Polish relations**

The place and the role of non-governmental associations in strengthening of policy of belarusian-polish good neighbourhood on the example of activity of associations „Belarus-Poland" and „Poland-Belarus" are investigated in this article. An Attempt to formulate the offer on expansion of a circle of relatives on spirit of subjects of national diplomacy and consolidation of their creative potential is undertaken. Corresponding recommendations are presented by the state institutes and the public of both countries.

**Gieorgij Mikołajewicz Michalkiewicz** – dr nauk historycznych, kierownik Katedry Służby Dyplomatycznej i Konsularnej Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku.